Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае
Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 34 (178)	1—10 снежня	1934 г.

ЗМЕСТ

Сінаптычны агляд за дэкаду

Першы дзень дэкады тэрыторыя БССР была занята вільготнымі масамі морскага арктычнага паветра, якое насунулася з поўначы праз Скандынавію. Па меры руху на тэрыторыю кантынента, гэтая паветраная маса прагравалася і тэмпература ноччу даходзіла да —1-2 град., удзень да +2 град., з пахмурным надвор'ем і выпадзеннем месцамі шквалістых ападкаў, у выглядзе снега.

З 2-га па 4-ае снежня на тэрыторыю БССР з захаду насунулася больш вільготнае морскае палярнае паветра і дзякуючы праходжанню паветранага падзелу, які рухаўся на ўсход, назіралася пахмурнае надвор'е, выпадзенне аблажных ападкаў, у выглядзе снега і дажджа, якія месцамі вымераліся ў 6 мм за суткі. Тэмпература і яе ваганні ў сутачным ходзе засталіся амаль без змен, у параўнанні з першым днём дэкады.

З 5-га па 8-ае снежня на тэрыторыю БССР з поўначы праз Карскае, Барэнцава і Белае моры насунулася халоднае арктычнае паветра, якое спрыяла сухому пераважна яснаму на-

Табліца вынікаў метэаралагічных

№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
		1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі нагляд. мінімум
2	Дрыса . .	—1	1	—3	—3	—9	—12	—12	—9	—7	—3	—	—5	—	3	—18	7
13	Полацк . .	—1	1	—3	—5	—10	—12	—15	—8	—11	—5	—	—7	—4	3	—18	7
68	Гарадок . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
7	Нова-Каралёва . . .	—2	—1	—3	—7	—10	—14	—16	—9	—9	—7	—	—8	—4	1	—19	7
8	Лепель . .	—1	1	—1	—3	—9	—11	—13	—9	—7	—6	—	—6	—	2	—15	7
75	Плешчаніцы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
70	Бобр . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
13	Барысаў . .	0	2	0	—1	—8	—11	—13	—12	—9	—7	—	—6	—3	3	—17	8
16	Менск. . .	—1	2	—1	—1	—8	—11	—11	—11	—8	—6	—	—6	—3	3	—15	8
93	Бярэзіна . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
23	Мар'іна-Горка	—1	1	—1	—1	—7	—10	—10	—10	—8	—6	—	—5	—3	2	—15	8
25	Асіпавічы .	—1	1	—1	—1	—6	—10	—12	—10	—7	—7	—	—5	—4	3	—	—
10	Орша. . .	—1	0	—4	—5	—10	—14	—16	—10	—8	—6	—	—7	—4	2	—20	7
19	Горкі . .	—1	0	—5	—6	—11	—15	—16	—10	—7	—6	—	—7	—4	1	—20	7
89	Клічаў . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
28	Слуцк . .	1	1	—1	0	—5	—10	—12	—10	—8	—5	—	—5	—	2	—15	7
30	Мар.-Сосны .	0	1	—1	0	—5	—11	—15	—13	—9	—5	—	—6	—2	2	—20	8
21	Магілеў . .	—1	0	—3	—4	—7	—12	—15	—11	—8	—6	—	—7	—4	2	—19	7
73	Чавусы . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	Чэрыкаў .	0	0	—3	—4	—9	—12	—15	—12	—6	—5	—	—7	—4	2	—18	7
191	Касцюковічы.	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
31	Турск . .	0	1	0	—2	—7	—10	—12	—12	—8	—6	—	—6	—3	2	—16	8
32	Жлобін .	0	1	0	—1	—7	—10	—11	—10	—8	—6	—	—5	—3	2	—15	7
33	Жыткавічы .	0	0	0	0	—5	—10	—13	—13	—8	—5	—	—5	—2	2	—18	8
37	Калінкавічы .	0	1	—1	0	—5	—12	—14	—12	—9	—7	—	—6	—3	2	—19	8
39	Лельчыцы .	0	0	0	0	—4	—10	—14	—13	—9	—4	—	—5	—	2	—	—
85	Чэчэрск . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
83	Барба . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
38	Гомель . .	0	0	0	—1	—6	—10	—10	—3	—7	—5	—	—5	—3	2	—14	7
35	Васілевічы .	0	1	0	0	—6	—10	—12	—12	—9	—7	—	—6	—3	2	—17	8
40	Людвінава .	1	0	0	0	—5	—11	—12	—12	—10	—9	—	—6	—2	2	—18	9

назіранняў з 1—10 снежня 1934 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі ў мм												Метэаралагічныя з'явы (у дужках адзначаны числы)
	Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сума	
79	—	—16	7	2.0	8.0	..	..	..	..	..	..	..	..	—	9.0	туман (2, 4)
79	—	—	—	1.0	7.0	..	..	0.5	..	..	..	..	..	—	8.5	туман (4)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
76	0	—19	7	..	5.0	..	..	..	..	..	..	..	..	—	5.0	—
77	—	—14	7	0.5	5.0	0.1	0.1	0 1	..	..	..	..	..	—	5.8	туман (10) галалед. (10)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
81	—	—	—	0.3	1.0	..	..	..	..	..	..	..	..	—	1.3	туман (3, 10)
—	2	—10	7	1.0	1.0	..	0.1	0.1	0.1	0.1	0.1	..	0.2	—	2.7	туман (10)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
80	4	—16	8	0.1	0.4	..	0.2	..	..	..	..	..	..	—	0.7	—
74	—	—	—	0.2	0.6	..	0.1	..	..	..	..	..	..	—	0.9	туман (4, 10)
78	—	—19	7	..	6.0	0.3	0.2	0.1	0.1	..	..	..	..	—	6.7	туман (4, 7)
80	0	—19	7	0.1	7.0	..	..	0.1	0.1	..	..	..	..	—	7.3	бура (1, 2)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
80	—	—13	7	..	..	0.3	0.2	0.2	..	0.1	0.1	0.1	0.1	—	1.1	туман (2, 10)
76	—	—	—	0.5	0.1	0.5	1.0	0.5	0.5	..	..	..	..	—	3.1	туман (1, 2)
82	—	—	—	..	..	..	..	..	..	..	..	2.0	..	—	2.0	туман (3)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	7.0	0.1	..	..	..	..	..	..	..	—	7.1	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
77	2	—17	7	..	1.0	..	..	..	0.1	..	..	..	..	—	1 1	туман, галалед. (10)
72	—	—	—	0.1	1.0	0.1	0.1	0.1	0.1	..	..	..	..	—	1.5	туман (3)
—	—	—	—	0.1	..	1.0	0.1	..	0.1	..	..	..	..	—	1.3	туман (3, 7)
76	—	—	—	..	0.3	0.1	1.0	..	..	..	..	..	..	—	1.4	туман (10)
—	—	—	—	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	—	—	—
—	—	—	—	..	1.0	0.1	0.1	0.1	0.1	..	..	..	..	--	1.4	галалед. (3)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
72	2	—13	8	1.0	0.1	0.2	0.1	0.1	..	..	..	..	..	—	1.5	туман (3, 4)
74	—	—16	9	0.1	0.2	..	0.6	..	..	..	..	..	..	—	0.9	туман (10)
75	—	—	—	..	0.1	..	3.0	..	0.1	..	0.1	..	..	—	3.3	туман (10)

двор'ю і мінімальная тэмпература даходзіла да —17—20 град., а максімальная да —4—8 град. 5-га снежня назіраліся месцамі выпадзення зусім незначнага снега.

9-га і 10-га снежня арктычнае паветра, дзякуючы доўгаму знаходжанню на кантыненце, канчаткова ператварылася ў кантынентальна-палярнае і па прычыне патоку з захада цёплага морскага палярнага паветра, на тэрыторыі БССР назіралася пераважна пахмурнае надвор'е са значным павышэннем тэмпературы, якая ноччу даходзіла да —10—12 град. удзень —2—4 град.

Захарык.

Метэаралагічная характарыстыка з 1—10 снежня 1934 г.

У гэтай дэкадзе ў т-ры паветра адбылася значная змена. У мінулым месяцы т-ра трымалася ўвесь час вышэй нармальнай, у гэтай-жа дэкадзе яна ў сярэднім на 3-4° ніжэй нармальнай. У першыя 2 дні т-ра хісталася ад +2 да —2°, 3-га на паўночным усходзе пачалося зніжэнне, 5-га гэта зніжэнне назіралася ўжо і на паўднёвым захадзе. У выніку чаго 7-га т-ра хісталася ад —10° да —16°. У наступныя дні яна некалькі павысілася.

Сярэдняя дэкадная т-ра хісталася ад —5 да —8°. Максімальная т-ра была раўна 1—3° і паўсюды наглядалася 7-га, або 8-га чысла.

Ападкаў за гэту дэкаду выпала зусім малая колькасць. Асабліва мала (ад 1-2 мм) выпала ў цэнтральнай і паўднёвай частках БССР. На поўначы (Полацк, Дрысса) і на ўсходзе (Орша, Горкі, Чэрыкаў) выпала крыху больш ападкаў (ад 7 да 9 мм). Выпадалі яны пераважна 2-га. У перыядзе з 3-га па 10-ае па ўсёй БССР наглядалася пераважна зусім сухое надвор'е.

Вятры пераважалі паўднёва-ўсходніх і паўднёва-заходніх напрамкаў, са значнай хуткасцю.

Воблачнасць складала ў сярэднім 60% агульнага пакрыцця неба.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідраметхарактарыстыка з 1-га па 10-ае снежня 1934 г.

Надвор'е справаздачнай дэкады адзначаўшаяся даволі нізкімі тэмпературамі, пры адсутнасці ў большай частцы рэспублікі снегавога насцілу не было шкодным для азімых культур. Гэта можна заключыць з таго, што ход тэмпературы на працягу дэкады не меў рэзкіх скачкоў. З 1-га па 7-ае тэмпература паветра кожны дзень паступова падала, а пасля пачала ўздымацца таксама паступова і мінімальная тэмпература далёка не даходзіла да крытычнай тэмпературы, якая можа вытрымлівацца азімымі пасевамі.

В. Стэфановіч.

Табліца 1

Сярэдне-дэкадных тэмператур за жнівень—лістапад 1934 г. у параўнанні з 1933 г. і сярэдняй шматгадовай

Зоны	Год	Жнівень				Верасень				Кастрычнік				Лістапад			
		дэкады			Сярэд. за месяц	дэкады			Сярэд. за месяц	дэкады			Сярэд. за месяц	дэкады			Сярэд. за месяц
		1	2	3		1	2	3		1	2	3		1	2	3	
Паўночная	1934	18	16	16	17	17	13	11	14	12	5	8	8	4	5	—	—
	1933	17	14	15	15	11	10	11	11	6	7	4	6	2	—3	—5	—2
	Норма	16	15	14	15	12	10	8	10	6	4	2	4	0	—1	—3	—1.5
Цэнтральная	1934	19	17	17	18	18	13	12	14	12	6	8	9	3	5	—	—
	1933	17	14	14	15	11	10	12	11	7	8	4	6	3	0	—3	0
	Норма	17	16	15	16	13	11	10	12	7	5	3	5	2	0	—2	0
Паўднёвая	1934	19	18	19	19	18	13	12	14	13	6	8	9	4	6	—	—
	1933	18	15	15	16	11	11	13	11	18	9	6	8	4	2	—3	1
	Норма	18	17	16	17	14	12	10	12	8	6	4	6	2	0	—2	0

Табліца 2

Ападкаў за ліпень—кастрычнік 1934 г. у параўнанні з 1933 годам і сярэдняй шматгадовай (нормай)

Зоны	Год	Ліпень				Жнівень				Верасень				Кастрычнік			
		дэкады			За месяц	дэкады			За месяц	дэкады			За месяц	дэкады			За месяц
		1	2	3		1	2	3		1	2	3		1	2	3	
Паўночная	1934	80.8	24.6	44.6	150.0	7.2	24 6	11.8	43.6	0.8	0.8	27.7	29.3	11.5	22.4	2.9	36.8
	1933	—	—	—	—	23.6	51.7	39.2	114.5	33.2	27.9	0.9	62.0	30.5	16.0	11.3	57.8
	Норма	—	—	—	80	—	—	—	85	—	—	—	50	—	—	—	50
Цэнтральная	1934	66.0	29.1	50.5	145.6	10.9	41.7	9.2	61.8	4.5	0.6	18.0	23.1	3.8	29.5	0.3	33.6
	1933	—	—	—	—	29.4	44.5	58.3	132.2	52.6	31.5	1.9	86.0	29.4	26.3	20.2	75.9
	Норма	—	—	—	85	—	—	—	80	—	—	—	55	—	—	—	50
Паўднёвая	1934	74.3	16.5	50.3	141.1	35.6	34.9	2.7	73.2	7,6	0.4	7.7	15.7	1.3	27.7	0.4	29.4
	1933	—	—	—	—	32.9	24.4	55.6	112.9	64.3	39.1	1.5	104.9	14.0	34.6	20.5	69.1
	Норма	—	—	—	90	—	—	—	70	—	—	—	50	—	—	—	50

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў з 1—10 снежня 1934 г.

№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхновага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
2	Дрыса	SE	4	W	—	—	6	6	замёрзшая
43	Полацк	SE	4	W	9	—	6	6	"
68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
7	Нова-Каралёва	W	4	NW	9	33	8	6	замёрзшая
8	Лепель	SE	4	NW	12	—	6	6	замёрзшая
75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
13	Барысаў	SE	4	NW	9	—	6	6	замёрзшая
16	Менск	SE	4	NW	9	—	6	6	"
93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
23	Мар'іна-Горка	S	4	W	12	—	6	6	замёрзшая
25	Асіпавічы	SE	4	NW	12	—	6	6	"
10	Орша	SW	2	NW	12	—	6	6	"
19	Горкі	—	4	W	12	012	6	6	"
89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
28	Слуцк	SE	4	SE	12	—	6	6	замёрзшая
30	Мар'іна-Сосны	E	4	W	12	—	6	6	"
21	Магілеў	—	3	NW	6	—	6	6	"
73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
27	Чэрыкаў	W	4	NW	9	—	8	8	замёрзшая
191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
31	Турск	W	4	NW	12	—	6	6	замёрзшая
32	Жлобін	W	4	W	12	—	6	6	"
33	Жыткавічы	SE	4	E	7	—	6	6	замёрзшая
37	Калінкавічы	E	4	E	7	—	6	6	"
39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	6	—	"
85	Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—
83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
38	Гомель	W	4	W	4	—	6	6	замёрзшая
35	Васілевічы	SW	4	NW	6	33	6	6	"
40	Людвінава	N	4	NW	9	—	8	8	"

Сел.-гасп. гідраметхарактарыстыка восені 1934 г.

Масавы сеў азімых увосень 1934 г. разгарнуўся ў другую дэкаду жніўня і працягваўся да другой дэкады верасня. Вядома, што галоўнымі метэаралагічнымі фактарамі, уплываючымі на поспех правядзення сева, хуткасць і дружнасць прарастання высеянага насення і развіцця ўсходаў, з'яўляецца вільгаць і цяпло.

Прадпасяўны перыяд, а іменна ліпень месяц характарызуецца вельмі вялікай колькасцю ападкаў па ўсёй тэрыторыі рэспублікі. Месцамі месячная колькасць ападкаў дасягала 200 і больш мм пры сярэдняй шматгадовай норме 90—100 мм. Аднак дзякуючы таму, што ападкі насілі ў большасці ліўнявы характар, накапленне запасаў вільгаці ў глебе не магло быць празмерным.

Жнівень даў нераўнамерную колькасць ападкаў на поўдні БССР іх выпадала каля нормы, у сярэднім па паўднёвай зоне—73 мм пры норме ў 70 мм, у астатніх раёнах значна менш ад 75% у цэнтральнай зоне да 50% у паўночнай. Больш значныя ападкі выпалі 5-6 і 13—16 жніўня. Другая пяцідзёнка і трэцяя дэкада былі пераважна без ападкаў. Сярэдняя дэкадная тэмпература паветра жніўня м-ца, як і сярэдняя месячная была на 2° вышэй нормы, што ў нашых умовах бясспрэчна было спрыяючым момантам.

Першая і другая дэкады верасня былі сухімі і з малай колькасцю ападкаў з высокай тэмпературай, так у першую дэкаду выпала ў паўночнай зоне менш 1 мм, у цэнтральнай і паўднёвай зонах адпаведна 5 і 8 мм. У другую дэкаду па ўсёй рэспубліцы праходзілі вельмі незначныя ападкі, даўшыя ў сярэднім па зонах не больш 1 мм. Трэцяя дэкада верасня адзначаецца амаль штодзенна праходзячымі ападкамі.

Сумарна за месяц: па паўночнай зоне ад 20 да 40 мм у сярэднім 29 мм пры норме 50 мм, па цэнтральнай зоне ад 17 да 35 мм у сярэднім 23 мм пры норме 55 мм і па паўднёвай зоне ад 10 да 25 мм у сярэднім 16 мм пры норме 50 мм.

Тэмпература паветра на працягу ўсяго месяца была значна вышэй нормы, у першую дэкаду на 5°—4°, у другую на 3°—1° і ў 3-ю дэкаду на 2°-3°.

Кастрычнік м-ц у некаторых мясцох таксама даў вялікі недабор ападкаў у параўнанні з нормай. Па паўночнай зоне выпала ад 30 да 50 мм, у сярэднім 37 мм пры норме ў 50 мм, у цэнтральнай ад 20 да 40 мм—у сярэднім 34 мм пры норме ў 50 мм і па паўднёвай—ад 25 да 40 мм, у сярэднім 29 мм пры норме 50 мм. Прычым ападкі выпадалі галоўным чынам у другую дэкаду, першая-ж і трэцяя дэкады адзначаліся вельмі нязначнымі ападкамі.

Тэмпература паветра была высокая—на 4°—6° вышэй нормы ў першую і трэцюю дэкады і блізка да нормы ў 2-ю дэкаду.

Лістапад адзначаўся больш часта выпадаючымі ападкамі.

Тэмпература паветра была ў першую дэкаду вышэй ад нормы, на поўначы на 4°, на поўдні на 2°. У другую дэкаду па ўсёй рэспубліцы вышэй ад нормы на 5°—6°.

Сухая і цёплая восень гэтага году была поўнай процілеглаесцю мокрай і халоднай восені 1933 г. Для падрыхтоўчых

палявых работ і севу ў максімальна ўшчыльненыя тэрміны ўмовы надвор'я восені былі вельмі спрыяючымі.

Масавыя ўсходы азімых з'явіліся ў трэцюю дэкаду жніўня і першую дэкаду верасня. Фаза кушчэння наступіла на поўдні— к канцу другой дэкады верасня, а на поўначы к канцу трэцяй дэкады.

К моманту спынення вегетацыі, якая адбылася паміж 21—24 лістапада азімыя культуры знаходзіліся ў поўным кушчэнні і прышлі да зімоўкі ў добра падрыхтаваным стане.

(Глядзі лічбовыя табліцы).

В. Стэфановіч.

ЛІТАРАТУРА, ПАДРЫХТАВАНАЯ ДА ДРУКУ РАБОТНІКАМІ ГК АГМС БССР і ВЫШАЎШАЯ З ДРУКУ ў 1933/34 г.

I. ВЫШЛА З ДРУКУ:

1. Праф. **Кайгарадаў.**—Клімат БССР, Зах. Беларусі і сумежных краін. Менск, т. I 1933 г. і т. II 1934 г.
2. **Кучынскі.**—Замаразкі і барацьба з імі, 2-е выд. Менск, 1934 г.
3. **Кучынскі.**—За рэарганізацыю метабслугоўвання торфаразработак. Журн. „Торфяное дело" № 4, 1934 г.
4. **Зборнік** гідраметрычных матэрыялаў за 1929-30 гг., выд. 1933 г. (продажа толькі для ўстаноў па заяўках).

II. ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ДРУКУ:

1. Проф. **Кайгарадаў** і інж. **Дановіч.**—Водны баланс рэк: Зах. Дзвіны і Верхняга Дняпра.
2. **Звесткі** аб узроўнях вады па судаходных рэках: Верхняга Дняпра і Зах. Дзвіны за 1916—1930 гг. Пад рэдакцыяй Дановіч.
3. **Лісіцкі.**—Уплыў лясоў на гідралагічны рэжым Верхняга Дняпра. (Здана к-ту Вялікага Дняпра пры БАН).
4. **Ліўшыц** і **Лісіцкі.**—Гідралагічны нарыс р. Зах. Дзвіны (манаграфія). Здана для друку БАН.
5. **Дановіч** і **Ліўшыц.**—Аналіз найбольш ужываемых формул стока.
6. **Дановіч.**—Каэфіцыенты веснавога стока некаторых рэк БССР. (Известия ГГИ).
7. **Дановіч** і **Лісіцкі.**—Аналіз формулы Ішкоўскага. (Известия ГГИ).
8. **Дановіч.**—Да пытанняў падліку вільгаці. (Известия ГГИ).
9. Гідралагічны справачнік (брыгада). Изд. ЦБВК СССР.

III. ПАДРЫХТАВАНА ДА ДРУКУ:

1. **Малішэўская.**—Клімат г. Менска.
2. **Малішэўская.**—Паўтараемасць сярэдніх месячных тэмператур па 8 мет. станцыях.
3. **Малішэўская.**—Паўтараемасць сутачных колькасцей асадкаў.
4. **Міціна.**—Зімовы рэжым прамерзання глебы.
5. **Міціна.**—Снегапаход і яго народнагаспадарчае значэнне.
6. **Кучынскі.**—Клімат жылога памяшкання ў зімовы перыяд (дамы бітаніраваныя і стандартныя).
7. **Кучынскі.**—Метэаралагічныя ўмовы здабычы і сушкі фрэзернага торфа.
8. **Рабаконь.**—Гідраметумовы вегетацыі асноўных с/г культур.
9. **Рабаконь.**—Уплыў мікроклімата на развіццё бульбяной хваробы.
10. Проф. **Кайгарадаў.**—Кліматалагічная характарыстыка 6-га гідралагічнага раёна.
11. Проф. **Кайгарадаў.**—Асадкі і снегавы насціл па басейнах галоўнейшых рэк БССР.
12. **Малішэўская** і **Кучынскі.**—Клімат БССР (брашура).
13. **Азарковіч.**—Веснавое палаводдзе 1931 г.
14. **Зборнік** гідраматэрыялаў па рэках БССР за 1931 г.
15. **Зборнік** метназіранняў за 1931-32 г.г.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Друк. БелАН. Зак. № 420. Гарліт № 53. Тыр. 600 экз. 10 стар.